# *На тым тыдні...*

✓ **20 студзеня** адкрылася **выстаўка жывапісу, графікі і скульптуры «Час магнатаў»** выкладчыкаў і навучэнцаў мінскай гімназіі-каледжа мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка. Выстаўку арганізавалі Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі і мастацкая галерэя «Універсітэт культуры».



*Станіслаў Кішка (скульптар Іван Арцімовіч)*

Экспазіцыя прысвечаная Залатому веку – яго гісторыка-культурнай спадчыне і выдатным асобам. Мэтай правядзення выставачнага праекта з'яўляецца творчае асэнсаванне і папулярызацыя аднаго з самых важных гістарычных перыядаў Беларусі – XV – XVIII стст.

✓ **21 студзеня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **ўрачыстая цырымонія падвядзення вынікаў конкурсу творчых працаў «...І, здавалася, жывое нешта йшло ад гэтых струн...»**, прымеркаванага да 90-годдзя паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка».

Мэтай конкурсу стала выхаванне любові і цікавасці дзяцей і дарослых да беларускай літаратуры і культуры, папулярызацыя творчасці Якуба Коласа, выяўленне, падтрымка і заахвочванне таленавітых дзяцей.

*Аб выніках конкурсу чытайце ў наступных нумарах.*

✓ **21 студзеня** ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася **прэзентацыя кнігі Анатоля Бутэвіча «Таямніцы Крэўскага замка: Падарожжа па нашай гісторыі з Вітаўтам Вялікім».**

Амаль 700-гадовы Крэўскі замак, які знаходзіцца ў Смаргонскім раёне, вядомы ў гісторыі найперш тым, што тут вялікі князь літоўскі Ягайла 14 жніўня 1385 г. падпісаў пагадненне з Каралеўствам Польскім, якое назвалі Крэўскай уніяй. Кніга стала працягам «замкавай» серыі, у якой ужо распавядалася пра Мірскі і Нясвіжскі замкі. Цяпер аўтар рыхтуе матэрыял для новай кнігі – «Таямніцы Гальшанскага замка».

*Падрабязней чытайце на стар. 2*

✓ **23 і 24 студзеня** ў аграсядзібе «Зарачаны» Пухавіцкага раёна Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры праводзіла **трэнінг для журналістаў аб спецыфіцы асвятлення ў прэсе праблемаў аховы гісторыка-культурнай спадчыны.** Пад час яго былі разгледжаныя пытанні ненавуковай рэстаўрацыі і сацыяльнага ўспрыняцця гісторыка-культурнай спадчыны, вайсковага пошуку і ўвекавечвання памяці ахвяраў войнаў, ішла гаворка пра гісторыка-культурную спадчыну і турызм, помнікі археалогіі, іх ахову і інтэрпрэтацыю ды інш. Тэмы асвятлялі старшыня БДТАПГК Антон Астаповіч, кіраўнік праектнага бюро Беларускага камітэта ІКАМОС Ігар Раханскі, загадчык аддзела аховы помнікаў упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталля Хвір, археолаг Мікола Плавінскі, дырэктар ТАА «Куфэрак падарожжаў» Юрый Меляшкевіч ды іншыя.

✓ **26 студзеня** ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі адбылася **прэзентацыя навуковай працы Ганны Кісліцынай «Культурны градыент: ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX – XXI стагоддзяў».** Прадметам дыскусіі стала беларуская літаратура, якой мы яе не ведаем, якую не вывучалі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ